# VIII. САКРАЛЬНА АРХІТЕКТУРА

DOI 10.33294/2523-4234-2019-29-1-318-330

**Тамара Габрусь**

# Спецыфіка ўжывання granёных архітэктурных форм у драўляным храмабудаўніцтве Беларусі

**Tamara Gabrus**

Стаття присвячена параўнальнаму аналізу ўжывання гранёных форм ў драўляным храмабудаўніцтве Беларусі і Ўкраіны, іх генезісу, семантычным і стылявым характарыстыкам. На прыкладзе шэрагу ўніяцкіх драўляных цэркваў Беларусі адзначаны адметнасці і ўзаемаўплывы лакальных архітэктурных школ суседніх рэгіёнаў Палесся. Беларускія храмы, архітэктоніка якіх уключае зрубы гранёных форм, вызначаюцца разнастайнасцю стылявых мадыфікацый, абумоўленых гісторыка-рэлігійнай і палітычнай сітуацыяй. У помніках перыяду барока васьміграная форма асноўнага зруба ўжывалася даволі рэдка, у асноўным пры будаўніцтве рэпрэзентатыўных храмаў. Больш шырока форма актагона ўжывалася ў вянчальных масах збудаванняў у якасці барабанаў купалоў шмат'ярусных вярхоў. Важным сацыяльным фактарам пашырэння ў беларускім драўляным храмабудаўніцтве гранёных форм паслужыла далучэнне ўсходніх тэрыторый Вялікага Княства Літоўскага да Расійскай імперыі і распаўсюджанне эстэтыкі класіцызма, арыентаванай на антычныя ўзоры.

*Ключові слова*: шматгранныя архітэктурныя формы, васьмерык, актагон, шасцерык сармацкага тыпу, стылявая эвалюцыя, лакальная школа

**Тамара Габрусь**

**Специфіка застосування гранчастих архітектурних форм у дерев'яному храмобудуванні Білорусі**

На конкретних прикладах храмового зодчества Білорусі досліджено генезис, семантичні і стильові характеристики гранчастих архітектурних форм у храмовому будівництві. Визначено, шо білоруські храми, архітектоніка яких включає зруби гранчастих форм, відзначаються різноманітністю стильових модифікацій, зумовлених історико-релігійною і політичною ситуацією. Важливим соціальним фактором позширення в білоруському дерев'яниму храмобудуванні гранчастих форм стало приєднання східних територій Великого князівства Литовського до Російської імперії і поширення естетики класицизму, орієнтованої на античні зразки. У пам'ятках періоду бароко восьмигранна форма основного зрубу застосовувалася досить рідко, головно при будівництві репрезентативних храмів. Дещо ширше форма октагона застосовувалась у горизонтальному ряді зрубу у формі барабанів куполів багатоярусних верхів.

Здійснено порівняльний аналіз застосування гранчастих форм в дерев'яному храмобудуванні Білорусі та України. На прикладі низки уніатських дерев'яних церков Білорусі відзначено особливості та взаємовпливи локальних архітектурних шкіл сусідніх регіонів Полісся.

Охарактеризовано також зміни в конструктивно-декоративній стилістиці архітектурних елементів білоруських храмів протягом другої половини XIX – початку XX ст. у зв'язку з поширенням зразків синодального будівництва Російської православної церкви. У завершенні гранчастих форм почали широко застосовувати кулеподібні кокошники або гострокутні щити.

*Ключові слова:* багатогранні архітектурні форми, восьмерик, октагон, шестерик сарматського типу, стильова еволюція, локальна школа

У вызначэнні самабытнасці беларускага драўлянага сакральнага дойлідства істотнай мастацвазнаўчай праблемай з'яўляецца адметная матывацыя выкарыстання і стылявая інтэрпрэтацыя гранёных форм зрубаў. У этнаграфічным сядзібным будаўніцтве Беларусі, дзе базавай адзінкай быў квадратны альбо прамавугольны зруб-клець, зрубы з большай за чатыры колькасцю граней не ўжываліся зусім. Але яны даволі шырока выкарыстоўваліся ў крапасным дойлідстве і драўляным храмабудаўніцтве, што мела шэраг прычын. Па-першае, у крапасных умацаваннях васьміграннысты зруб-вежа, так званы васьмерык, "круглік" ці "стоўп", параўнальна з вежай чацверыковай формы, меў дадатковыя фартыфікацыйныя якасці з пункту гледжання магчымасцей кругавой абароны. Па-другое, у канструкцыйным плане васьмігранная форма зруба мае пэўныя перавагі над квадратнай, паколькі дае большую плошчу пабудовы пры меншай даўжыні бервянняў і пры гэтым забяспечвае большую прасторавую жорсткасць і пластычнасць аб'ёмаў.

Аднак паходжанне і выкарыстанне гранёных форм ў сакральным драўляным дойлідстве мелі яшчэ дадатковыя, больш складаныя карані, у першую чаргу, семантычныя. Згодна Біблії, Божая Прамудрасць вылучыла ўпарадкаваны Сусвет з касмічнага хаоса з дапамогай кругавой рысы. У драўляным усходнеславянскім храмабудаўніцтве васьмігранная форма зруба, як умоўна круглая, семантычна атаясамліваецца з Сусветам і сваёй геаметрычнай дасканаласцю выяўляе добраўпарадкаванасць і гармонію Божага Свету. У кантэксце прафесійнай архітэктуры азначаная кампазіцыя генетычна паходзіць ад антычных храмаў-ратонд, у этнаграфічным кантэксце – ад паганскіх капішчаў-кантынаў, дзе форма круга была салярным знакам ці знакам Пяруна.

Калі параўнаць характар ужывання шматгранных форм зрубаў у драўляным сакральным дойлідстве Беларусі і Ўкраіны, можна адзначыць і агульныя рысы, і істотную розніцу. Ва ўкраінскіх цэрквах розных лакальных школ паўсюдна трапляюцца гранёныя формы у кампазіцыях храмаў з трох і нават болей (пяці ці дзевяці) зрубаў, з шмат'ярусным васьміграннымі светлавымі вярхамі. Больш таго, шматлікасць, пластычнасць і дэкаратыўнасць гранёных форм складаюць асноўныя стылявыя характарыстыкі украінскага барока. Большая, параўнальна з беларускім, прыхільнасць да гранёных форм ва ўкраінскім драўляным храмабудаўніцтве тлумачыцца, на нашу думку, тым, што ў паўднёвых рэгіёнах Палесся пераважа-

юць лясы з кароткаствольнымі ліставымі пародамі. Характэрна, што гранёныя формы ўсіх зрубаў, з шмат'яруснымі светлавымі вярхамі, трапляюцца пераважна ў Цэнтральна- і Ўсходнепалескім арэалах Беларусі, што, відавочна, абумоўлена ўплывам дойлідства Левабярэжнай Украіны.

Беларускія храмы, архітэктоніка якіх уключае зрубы гранёных форм, вызначаюцца разнастайнасцю стылявых мадыфікацый, абумоўленых гісторыка-рэлігійнай і палітычнай сітуацыяй. У традыцыйных беларускіх драўляных цэрквах гранёнымі часцей за ўсё былі алтарны і радзей асноўны зрубы, бабінец жа звычайна быў квадратны альбо прамавугольны. Гранёныя формы алтарных зрубаў драўляных цэркваў Беларусі ў новым матэрыяле імітавалі пластычныя паўкруглыя формы алтарных апсід мураваных храмаў, захоўваючы пры гэтым іх вобраз і семантыку Каўчэга Выратавання. У помніках часоў барока васьмігранная форма асноўнага зруба ўжывалася даволі рэдка, у асноўным пры будаўніцтве шыкоўных рэпрэзентатыўных храмаў і мела характэрныя стылявыя прыкметы. У часы барока ў архітэктурным формаўтварэнні іншы раз ужывалася неакрэсленая "цякучая" геаметрыя авала, напрыклад, у архітэктоніцы слуцкага Троіцкага касцёла езуітаў [1]. Найбольш шырока форма актагона ўжывалася ў вянчальных масах збудаванняў у якасці барабанаў купалоў шмат'ярусных вярхоў альбо шыек фігурных "банек" на двухвежавых фасадах храмаў базілікальнай канцэпцыі. Васьмігранныя аб'ёмы вярхоў звычайна рабіліся каркаснымі ці рубіліся гарызантальна, але "у шулы" (слупы з пазамі) і мацаваліся драўлянымі скобамі.

Квінтэсенцыяй храмабудаўнічых традыцый драўлянага дойлідства XVIII ст. усяго рэгіёна Беларускага Палесся стала архітэктура ўніяцкага Успенскага сабора Лешчынскага мужчынскага манастыра пад Пінскам. Праваслаўны манастыр ў прадмесці Лешча у летапісах згадваецца пад 1263 г., у ім знаходзілася рэзідэнцыя турава-пінскага епіскапа, сюды падчас небяспекі уцёк з Лаўрышаўскага манастыра пад Наваградкам сын вялікага князя літоўскага Міндоўга Войшалк. Манастыр значна пацярпеў падчас татарскай навалы ў 1540 г. Гісторыя праваслаўнай святыні падрабязна разгледжана ў вядомай працы Д. І. Даўгяла, дзе прыводзіцца інвентар манастыра 1588 г. [2]. Ансамбль манастыра ўключаў дзве драўляныя царквы (саборную Успенскую і "цёплую" Святадухаўскую), жылы брацкі корпус, дом архімандрыта, стайню, лазню, бровар. За манастырскай агароджай знаходзіліся дом святара, гумнішча, сад і агароды. Паводле інвентара, вялікая саборная царква, "з бруса тесанага в столп збудованая", яшчэ не была завершана. У 1603 г. Лешчынскі манастыр перайшоў да ўніятаў, у пачатку XIX ст. перададзены праваслаўным.

Успенскі сабор Лешчынскага манастыра пабудаваны ў 1740–1746 гг. у стылістыцы позняга барока, цяпер не існуе. Выява вядома па малюнках мастакоў Н. Орды, Ф. Бруздовіча і інш. Складаная архітэктоніка драўлянага сабора сінтэзавала структуру трохнефавай двухвежавай базілікі з яруснай шматсветлавой кампазіцыяй асноўнага зруба, уласцівай дойлідству Цэнтраль-

нага і Ўсходняга рэгіёнаў Беларускага Палесся. Двухсхільны гонтавы дах галоўнага нефа прарэзваў двух'ярусны светлавы верх (васьмерык на васьмерыку) з фігурным завершэннем, што спалучала шатровае пакрыцце і гранёны купал-"баню". Падобныя, але меншыя па памерах, медныя пазалочаныя вярхі, названыя ў інвентары "пукламі", былі пастаўлены над чацверыковымі вежамі галоўнага фасада, наверсе вальмаў над алтарнай часткай храма і над невысокімі сакрыстыямі, што стварала маляўнічую кампазіцыю вянчальных мас збудавання. У заглыбленні паміж вежамі над уваходам знаходзіўся балкончык для музыкаў. Унутры над бабінцам размяшчаліся даволі вялікія арганныя хоры. Бакавыя нефы былі адгароджаны ад галоўнага нефа і трактаваны як асобныя капліцы. Будынак меў традыцыйную для мясцовага "драўлянага" барока вертыкальную шалёўку з нашчыльнікамі.

Іншы раз у вянчальных масах збудаванняў з мэтай больш кантраснага размеркавання святла і ценю ўжываліся васьмерыкі і шасцерыкі так званага сармацкага тыпу, г. зн. з рабром пасярэдзіне франтальнай грані. Шыйкі ў выглядзе шасцерыкоў сармацкага тыпу яшчэ да нядаўняга часу мела барочная двухзрубавая Юр'еўская царква ў в. Валавель Драгічынскага р-на, з двухвежавым фасадам-нартэксам. Надзвычай прыгожыя і вытанчаныя "банькі" вежаў у 2010 г. былі заменены на цыбулістыя галоўкі [3].

Для шэрагу драўляных храмаў Цэнтральнага і Ўсходняга Беларускага Палесся перыяду позняга барока ўласціва шмат'ярусная будова вярхоў пры традыцыйнай трохзрубавай клецевай аснове і шырокае ўжыванне гранёных форм. Іх архітэктурныя характарыстыкі набліжаны да лакальных школ храмабудаўніцтва Ўкраіны. Прыкладамі могуць служыць трохзрубавыя трохверхія цэрквы XVIII ст. з шмат'яруснымі вярхамі-"банямі" у вёсках Ляскавічы Бабруйскай акругі (зафіксаваная фотаздымкам экспедыцыі 1928 г. В. Ластоўскага) [4], Маркаўшчына б. Гомельскага павета, адлюстраваная на малюнку Д. Струкава [5], Рубелі Столінскага р-на (*іл.1*), Лунінцы, Старой Беліцы (*іл. 2*) і інш. Паводле стылявых прыкмет гэтыя пабудовы спалучалі рысы віленскага і ўкраінскага барока. Надзвычай дынамічную і развітую кампазіцыю з чаргаваннем чацверыкоў і васьмерыкоў мела царква Св. Параскевы Пятніцы ў Мазыры (*іл. 3*), якая да 1795 г. была уніяцкай, пазней перададзена праваслаўным. У XIX ст. у Мазыры было яшчэ тры драўляныя цэрквы: Спаса-Праабражэнская, Прачысценская і Троіцкая [6].

Да характэрных узораў драўлянага храмабудаўніцтва XVIII ст. Мазыршчыны адносяцца таксама ўніяцкія цэрквы ў вёсках Міхалкі, Леніна, Скароднае, Белая Сарока (*іл. 4*) і інш. Міхайлаўская царква ў в. Людзеневічы (Жыткавіцкі р-н, б. Мазырскі п.) пабудавана у 1755 г. як уніяцкая на сродкі ўладальніка маёнтка Яленскага, рэканструявана ў 1912 г. (арх. В. Струеў). Першапачаткова царква была трохзрубавая са зрубамі роўнай вышыні, аб'яднаных агульным вальмавым дахам, з трыма светлавымі вярхамі. Асноўны васьміграннны зруб-актагон завяршаўся



*Іл. 1. Міхайлаўская царква. Рубель. Столінскі р-н. 1796 г.*



*Іл. 2. Мікалаеўская царква. Старая Беліца. Гомельскі р-н. 1770-я гг.*



*Іл. 3. Царква Параскевы Пятніцы. Мазыр. XVIII ст.*

двума светлавымі ярусамі (васьмерык на чацверыку) і пірамідальным шатром з галоўкай. Квадратны бабінец і пяцігранны алтарны зруб завяршаліся падобнымі светлавымі васьмерыкамі з шатрамі. Пры рэканструкцыі ў 1886 г. да першапачатковага бабінца быў прыбудаваны вялікі прытвор, на які перанесены верхні васьмерык. Гэта пераўтварыла кампазіцыю храма ў артадаксальна рускую чатырохчасткавую (з трапезнай), што знізіла яго эстэтычную выразнасць і сакральную сімволіку. Традыцыйная вертыкальная шалёўка з нашчыльнікамі была заменена на гарызантальную. У 1915 г. стаяла пытанне аб зносе царквы, чаму супрацістаялі вучоныя Імператарскай археалагічнай камісіі [7].

Падобную архітэктоніку, характэрную для Ўсходняга Палесся, мела царква св. Параскевы Пятніцы ў в. Вялікія Аўсюкі былога Рэчыцкага павета (цяпер Калінкавіцкі р-н), зафіксаваная на фотаздымку І. Сербава [8, с. 299]. Пабудавана яна была, верагодна, у канцы XVIII ст., перабудавана ў 1850 г. Не існуе. Будынак царквы складаўся з трох зрубаў аднолькавай вышыні (квадратнага кафалікона, пяцігранных бабінца і алтарнага), накрытых агульным шматсхільным дахам з трохвугольнымі навісямі ў месцах злучэння зрубаў. Кожная частка завяршалася двух’яруснымі васьміграннымі вярхамі з галоўкамі, што стваралі сіметрычную трохвуголь-



*Іл. 4. Мікалаеўская царква. Белая Сарока. Нараўлянскі р-н. 1750 / 1869*

ную кампазіцыю вянчальных мас. Унутры зрубы былі перакрыты самкнутымі скляпеннямі са светлавымі васьмерыкамі над кафаліконам і алтаром. Шалёўка сцен вертыкальная з нашчыльнікамі і арачным падзорам. Пры ўваходзе пазней прыбудаваны нізкі прытвор з двухсхільным дахам.

Падчас паэтапнага далучэння беларускіх земляў да Расійскай імперыі шэраг драўляных святынь былі ўзведзены ў стылі пераходным ад барока да класіцызму. Праявай гэтага стаў паступовы адыход ад маляўнічай дынамікі шмат’ярусных барочных вярхоў да стрыманай статычнасці манументальных пакатых купалоў на вялікіх васьміgranных светлавых барабанах. Пасля далучэння да Расійскай імперыі архітэктура праваслаўных храмаў на тэрыторыі Ўсходняга Палесся набыла выразныя рысы класіцызму, што выявілася ў шырокім выкарыстанні манументальных цэнтрычных васьміgranных форм у вянчальных масах збудаванняў.

Ільінская царква ў Гомелі пабудавана ў 1793–1794 гг. як стараабрадніцкая (*іл. 5*). У трохзрубавай кампазіцыі храма выразна дамінуе кубападобны кафалікон, увенчаны двума ярусамі светлавых васьмерыкоў, падзеленых шырокімі прычолкамі. Пяцігранны алтарны зруб і вялікі бабінец значна больш нізкія за асноўны зруб. Над бабінцам надбудавана двух’ярусная вежа-званіца (васьмерык на чацверыку). Верхнія васьмерыкі кафалікона і званіцы



*Іл. 5. Ільінская царква. Гомель. 1794*

накрыты пакатымі самкнутымі купаламі з вытанчанымі галоўкамі, што надае збудаванню мастацкую цэласнасць. З 1850 г. царква перададзена праваслаўным і перабудавана. Раней бабінец быў абкружаны з трох бакоў адкрытай арачнай галерэяй (цяпер зашклёная). Часткова ацалела традыцыйная вертыкальная шалёўка з нашчыльнікамі і падзорам [9, II, № 65].

Відавочна, што, акрамя ўплыву мураванай прафесійнай архітэктуры барока розных рэгіёнаў Вялікага Княства Літоўскага, яшчэ адным важным сацыяльна-ідэалагічным фактарам пашырэння ў беларускім драўляным храмабудаўніцтве гранёных архітэктурных форм паслужыла паступовае далучэнне ўсходніх тэрыторый Беларусі да Расійскай імперыі і распаўсюджанне эстэтыкі класіцызма, арыентаванай на антычныя ўзоры, а затым і псеўдагістарычных стыляў. Генетычная і сімвалічная сувязь цэнтрычных васьмігранных форм (актагонаў) з класікай антычнага свету абумовіла іх адметныя стылявыя трансфармацыі ў перыяд класіцызма. На пашырэнне планавых схем з васьмігранным асноўным зрубам пэўны ўплыў аказалі як павевы стылю класіцызм, так і жаданне рускай праваслаўнай царквы выкрэсліць з ужытку ўласцівую мясцовым уніяцкім цэрквам базілікальную канцэпцыю формаўтварэння.

Трохзрубавую кампазіцыю з васьмігранным асноўным і пяцігранным алтарным зрубамі і квадратным бабінцам пад агульным дахам мела царква ў Серніках (*іл. 6*), замаляваная Я. Драздовічам “на Піншчыне” ў 1926 г. [10, с. 65]. Кожны




*Іл. 6. Царква в. Сернікі пад Пінскам. Малюнак Я. Драздовіча 1926 г.*



*Іл. 7. Петрапаўлаўская царква. Галынка. Клецкі р-н. 1789 г.*

зруб завяршаў светлавы верх у выглядзе магутнага васьміграннага барабана з грушападобным купалам. Цяпер гэтая вёска знаходзіцца ў Ровенскай вобласці Ўкраіны, недалёка ад беларускага горада Столін. Да таго ж тыпу адносіцца Петрапаўлаўская царква ў в. Галынка (б. Слуцкі павет, цяпер Клецкі р-н), пабудаваная як уніяцкая ў 1788–1789 гг. па фундацыі зямяніна Чыжа (*іл. 7*). Помнік спалучае рысы барока і класіцызму: фігурны гранёны купал, вертыкальная шалёўка з нашчыльнікамі, развітыя прафіляваныя карнізы, паўцыркульнае акно на галоўным фасадзе. Трохзрубавы храм з васьмігранным двухсветлавым асноўным зрубам, выцягнутым ў папярочным напрамку, і квадратнымі бабінцам і алтарным зрубам, якія накрытыя двухсхільнымі дахамі з трохвугольнымі франтонамі на тарцах. Інтэр’ер кафалікона перакрыты самкнутым скляпеннем. Царква перабудоўвалася ў 1863 і 1990-я гг.: прыбудаваны чатырохкалонны порцік, купал заменены шатром з вежачкай.

У перыяд класіцызма адбылося вяртанне да строга цэнтрычных гранёных кампазіцый ратандальных храмаў. Аб’ёмна-прасторавыя кампазіцыі храмаў з асноўным зрубам васьміграннай формы, які аб’яднаны з бабінцам і алтаром агульным шматсхільным дахам, але без светлавых вярхоў, назіраюцца пераважна ў Цэнтральна-Палесскім рэгіёне. Па датах узвядзення большасці помнікаў гэтай

групы (усе яны пабудаваны ў 1-й палове XIX ст.) можна зазначыць, што тут сакральная сімволіка актагона арганічна ўзаемадзейнічала з эстэтычнай канцэпцыяй архітэктуры класіцызма.

Ужыванне ў трохзрубавых храмах асноўнага аб'ёма васьміграннай формы ў спалучэнні з прамавугольнымі і гранёнымі формамі алтарнага зруба і бабінца пад агульным вальмавым дахам над усімі зрубамі з'яўляецца адметным для пінскалунінецкай лакальнай школы храмабудаўніцтва. Прыблізна за 40 км на захад ад Пінска знаходзіцца Вазнясенская царква ў вёсцы Ляхавічы (Іванаўскі р-н), пабудаваная ў 1818 г. па той жа традыцыйнай для мясцовай лакальнай школы архітэктурна-тыпалагічнай схеме, але ўжо з прыкметамі класіцызма. Яе аб'ёмна-прасторавая кампазіцыя складаецца з трох роўнавышынных зрубаў: васьміграннага асноўнага, пяціграннага алтарнага і прамавугольнага бабінца, накрытых агульным кроквенным вальмавым дахам з трохвугольнымі застрэшкамі ў месцах злучэння зрубаў. Вальма над галоўным фасадам заменена свабодным трохвугольным франтонам, характэрным для мясцовага драўлянага дойлідства позняга барока і класіцызма. Галоўка на васьмерыковым барабане акцэнтуе асноўны аб'ём, перакрыты ўнутры ўсечаным пірамідальным скляпеннем на чатырох апорных слупах. Непасрэдна над бабінцам размешчана званіца з вялікімі паўцыркульнымі праёмамі. У архітэктуры гэтага помніка спалучыліся рысы двух суседніх лакальных школ драўлянага дойлідства і двух стылявых эпох, своеасабліва трансфарміраваных. У 1970 г., калі помнік быў даследаваны і абмераны намі, будынак захоўваў традыцыйную вертыкальную шалёўку з нашчыльнікамі і часткова гонтавы дах, але ў наш час будынак ужо цалкам абшыты сайдзінгам.

Барысаглебская царква ў вёсцы Лунін (Лунінецкі р-н) пабудавана ў 1824 г. [11]. Яе архітэктура набыла рысы класіцызму. Аснову трохзрубавай кампазіцыі складае васьмігранны зруб, накрыты пірамідальным шатровым дахам з галоўкай на васьміграннным барабане. Роўнавысокія з ім пяцігранны алтарны зруб і квадратны бабінец накрыты агульным вальмавым дахам. Пазней над бабінцам надбудавана званіца (васьмерык на чацверыку) з высокім шатром, што істотна змяніла аўтэнтычнае аблічча помніка. Сцены ашаляваны гарызантальна з вертыкальнай цокальнай панеллю, што зрокава мяняе прапорцыі збудавання і надае яму класіцыстычную статыку. Над уваходам у бабінцы размешчаны хоры.

Пакроўская царква ў Пінкавічах пад Пінскам мае дакладна тую ж аб'ёмна-прасторавую структуру. Яна пабудавана, верагодна, у XVIII ст. у традыцыях мясцовага драўлянага дойлідства, але перабудавана ў 1830 г. ужо з павевамі класіцызму. Гранёныя формы алтарнага і асноўнага зрубаў надаюць кампазіцыі выразную пластыку, што падкрэслена схіламі агульнага гонтавага даха. У кампазіцыі дамінуе магутны шацёр асноўнага зруба. Унутры ўсе часткі храма перакрыты драўлянымі скляпеннямі ў выглядзе ўсечаных пірамід. Над бабінцам размешчаны хоры, што сведчыць пра ўніяцкая паходжанне храма. Як і ў больш




*Іл. 8. Ільінская царква. Пінкавічы. Пінскі р-н. Малюнак Я. Драздовіча 1926 г.*

старых палескіх цэрквах, тут толькі адна прыбудова рызніцы з паўднёвага боку. Выгляд царквы зафіксаваны малюнкам Я. Драздовіча 1926 г. [10, с. 65]. На той час яна ўжо мела гарызантальную ашалёўку, але захоўвала аўтэнтычнае гонтавае пакрыццё даха (*іл. 8*). Аналагічныя архітэктурна-мастацкія характарыстыкі гэтага тыпу храмаў зафіксаваны Я. Драздовічам таксама ў вёсцы Падгацце на Піншчыне [10, с. 62].

У сярэдзіне XIX ст. актыўнае будаўніцтва праваслаўных цэркваў на тэрыторыі “Северо-Западного края” па праектах, зацверджаных Сінодам, прывяло да якасных змен у традыцыях мясцовага драўлянага дойлідства. Архітэктура храмаў набыла рысы псеўдарускага стылю як ў аб’ёмна-прасторавых кампазіцыях, так і дэкоры збудаванняў. Найбольшае пашырэнне атрымалі чатырохзрубавыя клецевыя храмы комплекснай канцэпцыі з рознай вышынёй і самастойным пакрыццем кожнага зруба. Да кубападобнага асноўнага аб’ёма кафалікона, увенчанага масіўным светлавым васьмерыком з купалам, па падоўжнай восі ўсход-захад далучаліся пяцігранны алтарны зруб і даволі вялікі прамавугольны бабінец, пераўтвораны ў характэрную для рускага храмабудаўніцтва “трапезную”. Да яе прыбудоўвалі нізкі прытвор, завершаны званіцай з высокім васьміграннным шатром. Традыцыйныя беларускія драўляныя храмы базілікальнай канцэпцыі

звычайна мелі толькі адзін уваход, праз бабінец. У храмах псеўдарускага ўзору рабілі тры ўваходы, аформленыя прытворамі. Прыкладам азначаных тэндэнцый можа быць архітэктура праваслаўных цэркваў у вёсках Вялікія Чучавічы Лунінецкага р-на (1846–1852), Дабрыгоры Бешанковіцкага р-на (1866), Худаўцы Крупскага р-на (1864) і інш.

У другой палове XIX – пачатку XX ст., у сувязі з дамінаваннем узораў сінадальнага будаўніцтва рускай праваслаўнай царквы, прынцыпова змянілася стылістыка канструкцыйна-дэкаратыўных архітэктурных элементаў. Паступова формы позняга класіцызму спалучаліся с формамі несапраўднай готыкі і псеўдарускага стылю. Кампазіцыйнае і мастацкае вырашэнне святынь стала больш здрабнёным і эклектычным. У кампазіцыі праваслаўных храмаў цыбулістыя галоўкі на тонкіх шыйках паўсюдна замянілі фігурныя шмат'ярусныя барочныя "банькі" і магутныя класіцыстычныя купалы. У аздобе гранёных форм вярхоў пачалі шырока ўжываць кілепадобныя какошнікі альбо вастравугольныя шчыты, так званыя габелі, якія з'яўляюцца трансфармацыяй у дрэве гатычных вімпергаў. Узорамі храмаў сінадальнага тыпу з чатырохчасткавай кампазіцыяй (з трапезнай) і псеўдарускай стылістыкай з'яўляюцца праваслаўныя цэрквы ў вёсках Ёдчыцы (Клецкі р-н, 1856), Вязынь (Вілейскі р-н, 1858), Кобрыне (1862). Прыкладам неарускага стылю можа служыць Дабравешчанская царква ў в. Кунаса (Нясвіжскі р-н), пабудаваная ў 1902 г. Будынак царквы ўвянчаны вялізным васьміграннным светлавым барабанам і праваслаўным пяцігалоўем. Кожная грань масіўнага актагона завершана шчытом-вімпергам.

Пад уплывам рэтраспектыўнага візантыйска-рускага стылю, панаваўшага ў расійскай мураванай архітэктуры таго часу, дэклараванага акадэмікам архітэктуры К. Тонам, адбылася спецыфічная трансфармацыя архітэктонікі традыцыйных чатырохзрубавых цэнтрычна-крыжовых храмаў у пяцігаловыя крыжова-купальныя візантыйскага ўзору. Паміж рамёнамі крыжовага ядра кампазіцыі пачалі ставіць невялікія чацверыковыя аб'ёмы, увянчаныя светлавымі васьмерыкамі з галоўкамі. Такім чынам фарміравалася кананічнае праваслаўнае пяцігалоўе па дыяганалях сяродкрыжжа, замест характэрнага для традыцый беларускага храмабудаўніцтва пяцігалоўя па баках свету, якое мае больш старажытную касмаганічную семантыку. Узорамі візантыйскага-рускага стылю ў драўляным храмабудаўніцтве з'яўляюцца Спаса-Праабражэнская царква з в. Новая Мыш Баранавіцкага р-на (1856) і Пакроўская царква ў в. Хатляны Уздзенскага р-на (1897).

1. Paszenda J. Kosciół jezuitów w Słucku // Kwartalnik architektury i urbanistyki. Warszawa, 1978. T. XXIII. Z. 3. S. 221−235; Габрусь Т. В. Слуцкі Троіцкі касцёл езуітаў // Случынна: мінулае і сучаснасць. Слуцк, 1995. С. 42−45.

2. Довгялло Д. И. Пинский Лещинский монастырь в 1588 г. // К истории православной западнорусской церкви до половины XVII в. Вильна, 1904. С. 115−133.

3. Габрусь Т. В. Вопросы сохранения художественной подлинности памятников деревянного сакрального зодчества Беларуси // Архитектура: сб. науч. тр. Минск: БНТУ, 2014. Вып. 7. С. 11−16.

4. Фотографіі экспэдыцыі катэдры этнографіі, летам 1928 году пад кіравецтвам В. Ластоўскага па маршруту Слуцак – Осташковічы адбытай // Цыфравы архіў Музея старажытнабеларускай культуры ІМЭФ.

5. Навуковая бібліятэка Вільнюскага універсітэта, ад. рукапісаў, г. Вільнюс. Ф. 78, № 291.

6. Нацыянальны гістарычны архіў Беларусі, г. Мінск. Ф. 136. Воп. 1. Спр. 40963.

7. Известия Императорской Археологической комиссии. Москва, 1915. Вып. 59. С. 15.

8. Беларусы ў фотаздымках Ісака Сербава. 1911–1912 = The Belarusians in the photos by Isaac Serbau = Baltarusiai Isako Serbovo metu totografijose. Мінск: БелЭн імя П. Броўкі, 2012. 456 с.

9. Габрусь Т. В. Сакральнае дойлідства Беларусі: 1000-гадовая спадчына = Сакральное зодчество Беларуси: 1000-летнее наследие = The Sacral Architecture of Belarus: Millennial Legacy. Мінск: "Беларуская навука", 2014. 483 с.

10. Язэп Драздовіч: альбом-манаграфія / уклад. М. Купава. Мінск: "Беллітфонд", 2002. 179 с.

11. Нацыянальны гістарычны архіў Беларусі, г. Мінск. Ф. 799. Воп. 33. Спр. 817. Арк. 78.

SUMMARY

**Tamara Gabrus**

**Specificity of the application of granular architectural forms in wooden temple building of Belarus**

Genesis, semantic and stylistic characteristics of the granular architectural forms in temple construction are explored on concrete examples of temple architecture of Belarus. It is determined that Belarusian temples, architectonics of which includes logs of the granular forms, are characterized by a variety of stylistic modifications due to the historical, religious and political situation. An important social factor for the expansion in the Belarusian wooden temple building of the grandiose forms was the accession of the eastern territories of the Grand Duchy of Lithuania to the Russian Empire and the spread of aesthetics of classicism, oriented to ancient specimens. In the monuments of the Baroque period, the octagonal form of the main log was used quite rarely, mainly in the construction of representative temples. A much wider form of octagon was used in the horizontal row of a log in the form of drums of domes of multi-tiered tops.

A comparative analysis of the application of the granular forms in the wooden temple building of Belarus and Ukraine is carried out. On the example of a number of Uniate wooden churches of Belarus, features and mutual influences of local architectural schools of neighboring regions of Polissya are noted.

The changes in the constructive-decorative stylistics of the architectural elements of the Belarusian temples during the second half of the 19th and at the beginning of the 20th century are also characterized in connection with the proliferation of samples of the synodal construction of the Russian Orthodox Church. At the end of the granular forms were widely used ball-shaped kokoshniki or sharp-edged shields.

*Keywords*: polyhedral architectural forms, octagon house, octagon, hexagon of Sarmatian type, stylistic evolution, local school